***1. Прачытайце беларускія прыслоўі***

**За добрым мужам і варона жона, а за благім і княгіня згіне.**
**Жонку выбірай і вачыма, і вушыма.**
**Да пяці гадоў песці дзіця, як яечка, да сямі пасі як авечку, тады выйдзе на чалавечка.**

***2. Паспрабуйце адужыць скарагаворкі***

**Адна сарока – адна марока, сорак сарок - сорак марок.**
**Ідзе скарагаворка са скарагаварчанятамі**

***3. Чытайце***

***Аканне:*** *пераход* ***о, э ў а***

Добра – дабро, цэны – цана, цэгла – цагляны, дрэмле – драмлю, мароз – маразы, горы – гара, ногі – нага, шчэбет – шчабятаць, восем – васьмёра, шэсць – шасцёра, кот – каты, голас – галасы, золата – залаты, гора – гараваць, род – нарадзіць, розум – разумець, роўны – раўняць.

**Яканне:** пераход **е, ё ў я**

Цёпла – цяпло, лес – лясы, сёлы – сяло, вецер – вятры, месці – мяту, сёстры – сястра, серп – сярпы, сем – сямёра, везці – вязуць, есці – ядуць, несці – нясуць, смех – смяяцца, лёд – лядовы, мёд – мядовы, вечар – вячэра, зелень – зялёны, вёслы – вясло, мёў - мяту.

Калі?
Дзе хто быў учора?
Калісьці
Аднойчы

Раніцай/раніцой
У першай палове дня
Удзень
У другой палове дня
Увечары
У восем гадзін раніцы
У гадзіну/ а першай гадзіне
У дзве гадзіны, тры гадзіны, у чатыры гадзіны/
А другой/ трэцяй/ чацьвёртай/ пятай/ шостай/ сёмай/восьмай/ дзевятай/ дзесятай гадзіне
У пяць гадзін
У шэсць гадзін вечара
У дванаццаць гадзін ночы
Адразу
Перш-наперш//перш за ўсё
Спачатку
Пасля
Потым

Што здарылася?

Панядзелак

Аўторак
Серада
Чацвер /але у Р.скл. чацвярга/

Пасля дожджыку ў чацвер

Пятніца
Субота
Нядзеля

Студзень
Люты
Сакавік

Красавік
Травень /май
Чэрвень

Ліпень
Жнівень
Верасень

Кастрычнік
Лістапад
Снежань

Ганнін учарашні дзень

Учора быў аўторак. Ганна прачнулася вельмі рана – у сем гадзін. Сама б яна ніколі так рана не ўстала, але зазваніў будзільнік. Трэба было ісці на заняткі. Ганна ўстала, гэта было вельмі цяжка. Сапраўды прачнуцца дапамог кубак кавы. У восем гадзін Ганна прыйшла на лекцыю. Лекцыя была вельмі цікавая. Потым былі семінарскія заняткі. Пасля заняткаў Ганна са сваёй сяброўкай Сашай пайшла на абед. У сталоўцы яны сустрэлі сваіх сяброў Рому і Колю.
- Прывітанне, дзяўчаты!
- Ой, Рома, Коля! Сто гадоў вас не бачылі!

Хлопцы таксама абрадваліся. Асабліва Рома, бо яму вельмі падабалася Ганна. У іх былі білеты на канцэрт Л.Вольскага ўвечары, і яны вырашылі пазваць дзяўчат.
- Што вы, дзяўчаты, робіце сёння ўвечары?
- Нічога асаблівага. Збіраліся рыхтавацца да семінару па літаратуры.
- У нас ёсць цікавейшая прапанова – хадзем з намі на канцэрт Л.Вольскага!
- Прапанова сапраўды цікавейшая. Я даўно хацела схадзіць на яго канцэрт. А ты, Ганна?
- Я б з задавальненнем пайшла.

У другой палове дня Ганна пайшла ў бібліятэку. Ёй трэба было пісаць курсавую. У бібліятэцы было вельмі холадна, і кніжка была нудная і нецікавая. Таму Ганна пайшла дамоў раней – а шостай гадзіне. Там яе ўжо чакала Сашка. Яны павячэралі і пайшлі на нулявы кіламетр – там яны дамовіліся сустрэцца з Ромам і Колям. Канцэрт ім вельмі спадабаўся. Да інтэрнату дзяўчаты вярнуліся

толькі а палове дванаццатай. За цэлы дзень яны вельмі змарыліся, таму адразу пайшлі спаць. Але яшчэ доўга размаўлялі паміж сабой пра канцэрт, пра хлопцаў і пра тое, што заўтра трэба ісці на семінар, да якога яны не падрыхтаваліся.

Добры дзяцел
(Англійская народная казка)

Ці ведаеце вы, што калісьці ў лесе .......... (быць) зусім ціха. Птушкі не ........... (ўмець) спяваць.
Адзіным спеваком ............... (быць) вецер. Ён ........... (шумець) у лісці, ............. (скрыпець) галінкамі дрэў. І вось аднойчы .............. (сабрацца) птушкі і .............. (пачаць) размяркоўваць паміж сабою песні. Кожная з іх .............. (хацець) атрымаць самую прыгожую.
- Мне хацелася б мець самую пяшчотную песню, - .............. (сказаць) галубка.
- А я ........... (ўзяць) бы што-небудзь вясёленькае, - .............. (сказаць) чыж.
Зязюля ............. (папрасіць), каб ёй ............ (даць – мн.лік) што-небудзь незвычайнае.
Толькі шэры салавейка адзінока ............ (сядзець) і сціпла ............ (маўчаць).
«Няўжо мне нічога не пакінуць?» - ............. (думаць) ён. – Мая жонка так любіць музыку!..» Дзяцел у гэты дзень ............. (аглядаць) і (лячыць) бярозкі ў лесе. Увечары ён (скончыць) свой абход, прыляцеў на сходку і .......... (папрасіць):
- Дайце мне, калі ласка, прыгожую песню. Я заўсёды буду вітаць ёю ўсход сонца.
Яму ........... (даць) песню. Самую доўгую і самую прыгожую. Але раптам ён ........... (заўважыць) салаўя.
- А якую песню табе ........... (даць)? - ........... (спытаць) дзяцел. – Праспявай мне, калі ласка.
- У яго няма песні! – хорам ........... (закрычаць) птушкі. Ён нічога не ........... (прасіць).
Шкада ............ (стаць) салаўя, і ён ........... (аддаць) яму сваю песню – самую доўгую і самую прыгожую.
Таму дзяцел ніколі не спявае. Але ўсе птушкі любяць і паважаюць яго.

(Пераклаў Я.Дубовік)